# Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь
# народны ансамбль танца «Апельсін ПЛЮС»
# Палаца культуры адкрытага акцыянернага таварыства «Гомсельмаш»

Ансамбль танца «Апельсін ПЛЮС» быў створаны ў 1996 годзе. У лютым 2002 года яму было нададзена найменне «народны аматарскі калектыў»; у кастрычніку 2013 года – званне «Заслужаны аматарскі калектыў» Рэспублікі Беларусь.

Зараз у ансамблі 34 удзельніка ва ўзросце ад 14 да 28 гадоў. Усе яны прыходзяць у калектыў пасля заняткаў у харэаграфічнай студыі пры ўзорным ансамблі танца «Апельсін» і трохгадовай працы непасрэдна ў ансамблі «Апельсін».

«Апельсін ПЛЮС» адрозніваецца наяўнасцю асабістага харэаграфічнага почырку. У рэпертуары больш за 40 пастановак, да прыкладу: беларускія танцы «Палескія гульні», «Весніцы», «З-пад гары», рускі танец «Чатыры двары», кітайскі танец з веерамі і іншыя. Поспехам у гледачоў карыстаюцца эстрадныя кампазіцыі «Васількі», «Жыві!», «Любімае кафэ», «Маскоўская вясна», «Полечка-поле» і г.д. А «Рускі валь», «Венгерская полька» і «Веснавыя галасы» – прыклады пастановак на класічную музыку. У «Апельсін ПЛЮС» ёсць сумесныя нумары з узорным ансамблем танца «Апельсін». Штогод у рэпертуары ансамбля з'яўляюцца 3-4 новыя танцы. Дастатковая колькасць нумароў і іх разнастайнасць дазваляюць калектыву прымаць удзел практычна ў любой праграме. Тут заўжды падтрымліваецца імкненне юнакоў і дзяўчат да творчага самавыяўлення: ўдзельнікі калектыву, схільныя да пастановачнай работы, маюць магчымасць ствараць уласныя харэаграфічныя нумары.

На рахунку «Апельсін ПЛЮС» больш за 60 канцэртных выступленняў штогод. Гэта не толькі ўдзел у мерапрыемствах для працаўнікоў «Гомсельмаша», але і выступленні на розных сцэнічных пляцоўках горада Гомеля і вобласці. Не пакідаюць абыякавымі ўдзельнікаў і кіраўнікоў «Апельсін ПЛЮС» запрашэнні да ўдзелу ў разнастайных дабрачынных акцыях, напрыклад праекты «Я змяняю свет» (2014 год) і «Падары ім шанец» (2017 год).

Справаздачныя канцэрты, якія сумесна ладзяць Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь народны ансамбль танца «Апельсін ПЛЮС» і Лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі – узорны ансамбль танца «Апельсін», адрозніваюцца разнастайнасцю нумароў, дынамізмам, высокай выканаўчай культурай танцораў, маляўнічасцю касцюмаў. Традыцыйна праграмы гэтых канцэртаў носяць тэматычны характар. Творчы падыход і адказнасць кіраўнікоў дазваляюць калектыву, пры неабходнасці, хутка і якасна зрабіць харэаграфічны нумар на любы прапанаваны музычны матэрыял.

Выступленні ансамбля бачылі гледачы Мінска, Брэста, Мазыра, Светлагорска, Рэчыцы, Буда-Кашалёва, Жлобіна, Лоева, Веткі, Добруша, Хойнікаў, Жыткавічаў, Оршы, Кобрына.

У творчай біяграфіі калектыву паездкі з канцэртамі ў Францыю (1996 год), Польшчу (2001 год), Сербію (2005 год), Чэхію (2009 год), Балгарыю (2014 год), Расію (2007–2010 гг., 2012 і 2017 гг.).





